**Сауліч, У.** Прага вяртання / У. Сауліч // Віцебскі рабочы. — 1987. — 3 верас. — С. 2.

**ПРАГА ВЯРТАННЯ**

Пасля ранення былому воіну-інтэрнацыяналісту Генадзю Броўку ампутавалі нагу. Інваліднасць? Пенсія? Генадзь пажадаў вярнуцца на трактар...

Да заканчэння службы Генадзю заставалася ўсяго два месяцы. Салдат напісаў ліст дырэктару роднага саўгаса «Чырвонабярэзінскі», што ў Докшыцкім раёне, Леаніду Антонавічу Шлому, каб чакалі яго.

Маўляў, вяртаецца ў свой саўгас. І абавязкова, як і да арміі, будзе працаваць на трактары.

Прачытаўшы той ліст, дырэктар сустрэўся з бацькам воіна – Аляксеем Сцяпанавічам Броўкам і падзяліўся сваёй радасцю з ім:

– Праз месяц-другі сын, Сцяпанавіч, прыедзе дахаты. Будзем старацца яму новы трактар.

Але хуткага вяртання не адбылося. У адным з апошніх баёў механік-вадзіцель БМП Генадзь Броўка атрымаў цяжкае раненне ў нагу. Пацягнуліся месяцы лячэння. Калі з ранай стала горш, Генадзь прасіў урачоў:

– Зрабіце, што ў вашых сілах, але захавайце мне нагу. Я хачу вярнуцца на трактар.

Генадзя лячылі самыя лепшыя ўрачы. Але і яны развялі рукамі:

– Нічога зрабіць не можам. Патрэбна ампутацыя.

За чатыры дні да аперацыі да яго прыехала маці Надзея Канстанцінаўна. Яна гаварыла пра дом. Пра тое, што ўсе яго чакаюць. Пра новы трактар. Яна яшчэ нічога не ведала пра ампутацыю. А ён нічога ёй не сказаў. Усміхнуўся:

– Едзь дадому, усё будзе добра...

Застацца ў дваццаць адзін год без нагі – гэта трагедыя. У Генадзя ўсё ўскладнялася тым, што са стратай нагі страчвалася надзея вяртання да любімай прафесіі механізатара.

Інваліднасць другой групы. Пенсію прызначылі. І сядзець, калі ўсе навокал працуюць.

Ён – не з такіх. Ён – не мог уседзець. Атрымаўшы пратэз, у першы ж дзень прайшоў тры кіламетры. Потым, з дня ў дзень, павялічваў нагрузку. І гэтак да 5–6 кіламетраў. Ён праходзіў часам больш, чым некаторыя здаровыя.

Ішоў на поле, дзе да арміі араў, сеяў, вывозіў арганіку. Цяпер на гэтым полі шчыравалі іншыя, яго равеснікі. І з кожным днём ад такіх «паходаў» рабілася ўсё больш балюча на душы. Ён не мог спакойна чуць рокат трактара. Не мог і сядзець дома. Падаўся вучыцца на майстра-абутніка.

Год вучобы, і вось ён ужо ладзіць заказчыкам абутак у Докшыцкім атэлье.

У рабоце хацелася забыцца. У снежні даў ажно тры планы. Мікалай Дзмітрыевіч Скакун, які ў абутковым цэху працуе ўжо дваццаць год, зазначае, што такіх работнікаў, як Генадзь Броўка, яму сустракаць не даводзілася.

Але і ў гэтай рабоце Генадзь не знайшоў суцяшэння. Зноў і зноў заводзіў гаворку пра трактар.

– На «Запарожцы» ж я езджу. Дык чаму на трактары нельга?

– Дык «Запарожац» жа ў цябе са спецыяльным, ручным кіраваннем, – адказвалі яму. – А трактараў такіх няма. Не выпускаюць.

– А я сам перараблю, – гарачыўся Генадзь. – Прыладжу рычаг на тармазы, каб рукой можна было дастаць. А газ таксама пераробл на ручны, як і ў «Запарожцы».

– Так і дазволяць табе трактар «курочыць». Ды і калі дадуць, то Дзяржаўтаінспекцыя не прапусціць. Як жа табе правы выдадуць?

І ўсё ж імкненне вярнуцца на трактар, надзея на тое, што праб'е час, калі ён зможа сесці за штурвал, не пакідала ні на дзень. І яна ўспыхнула для Генадзя з новай прыцягальнай сілай, калі прачытаў у газеце «Советская Белоруссия» артыкул пра такога ж, як і сам, хлопца з Вілейскага раёна Пятра Петрашкевіча. Па просьбе Пятра на Мінскім трактарным заводзе зрабілі трактар з ручным кіраваннем. І ён вярнуўся да любімай прафесіі.

Спачатку Генадзь не мог паверыць. Але ж тут, на газетнай старонцы быў змешчаны і здымак хлопца. Ён стаіць ля трактара. У поўны рост.

У адзін момант жыццё для Генадзя перайначылася. Як ён у гэты дзень спяшаўся дахаты! А там жонка Наташа трымала яшчэ адзін нумар гэтай жа газеты. Разам тут жа напісалі пісьмо ў рэдакцыю, каб дапамаглі і яму, Генадзю, вярнуцца на трактар.

Ліст з рэдакцыі прыйшоў вельмі хутка. А ў ім гаварылася, што трактаразаводцы не супраць вырабіць яшчэ адзін трактар з ручным кіраваннем. Вырабіць для яго, Генадзя Броўкі. Трэба толькі прайсці медыцынскую камісію: дома і ў Мінску.

Пакуль Генаязь Броўка яшчэ працуе ў атэлье. Рыхтуецца на рэспубліканскую камісію. З мясцовага РАПА павінны даць заяўку на завод на атрыманне трактара.

– Хацелася б, вельмі хацелася, – сказаў Генадзь, атрымаць трактар ужо ў гэтым годзе. Працаваць буду ў райсельгасхіміі. Недалёка ад дому на работу, а буду ўсё роўна ў полі. Ня зямлі!

**У. Сауліч**